Ад Уладзіка яшчэ не атрымліваў ніякіх вестак. Чакаю дню, каб быць нам разам.

Цалую Вас моцна.

Ваш *Адзік*.

## № 117. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*1 жніўня 1935 г.*

Любыя Анечка, Лорачка і Лялячка!

Успомніў я, любыя мае, што сёньня 11–ая гадавіна нашага супольнага жыцьця, і сумна мне стала, што ня разам я з Вамі, што ня можам яе адзначыць з сваімі блізкімі і роднымі радасьцю гэтага дню. Але ня сумую. Ня сумуйце і Вы, любыя!

Анечка, табе прыехаць сюды трэба абавязкова. Заходзіў я сёньня ў Горано, пытаўся ў Забал[отных] пра тваё назначэньне. Ён сказаў, што ты канчатковае згоды не дала, сказаўшы „падумаю“. Пасьля ж таго ня была, і таму назначэньня яшчэ няма. Папытаў, калі прыедзеш. Я адказаў, што хутка, магчыма, гэтымі днямі, а то 6 жніўня. На гэта ён сказаў, тады няхай сёмага зойдзе і атрымае назначэньне. Дык ось бачыш, табе тут трэба быць абавязкова. Апроч таго, шмат ёсьць аб чым пагутарыць. Так што ні ў якім разе не адкладай свайго наведаньня сюды. Добра, калі прыедзеш нават раней выходнага. Чакаю цябе з нецярплівасьцю.

Любыя дзеткі, хутка ўжо будзем разам.

Цалую Вас моцна ўсіх.

Ваш *Адзік*.

## № 118. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*8 жніўня 1935 г.*

Любыя Анечка, Лорачка і Лялячка!

Хацелася–б чым–небудзь Вас парадаваць, ды ня маю чым. Усё ў тым–жа стане, як і пакінула ты, Анечка.

З кватэраю нічога не высьвятляецца. У Горце гавораць, што будуць рэмантаваць тыя пакоі, якія мы з табою аглядалі. А напраўду ці будуць, хто ведае: нешта нічога не значно.

Думаю падаць заяву, каб далі одпуск і тым часам шукаць пакой.

У Горано не хадзіў яшчэ. Мо’ заўтра урву часіну і зайду. Даведаюся.

Ніколі я яшчэ не адчуваў сябе так, як у гэтым, што цяпер, становішчы. Проста ня ведаеш, за што й рукі зацяць. Такое беспрасьвецьце паглынула. Хай яго паляруш!

Ні ад Уладзіка, ні ад Язэпа больш вестак ня было. Як гуляюць дзеці?

Цалую вас моцна.

Ваш *Адам*.

Заўтра ад’яжджаюць Максім і Кіпель. Азбукіну далі пашпарт трохмесячны. Сёньня гаспадыня атрымала тэлеграму ад свайго мужа, што едзе сюды.